Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі

«Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава»

(ВДУ імя П.М. Машэрава)

УДК 94(476.5):364.692-7879:613.391(470.4)«192»

№ дзяржрэгістрацыі 20180359

Інв. № ________________

ЗАЦВЯРДЖАЮ:

Прарэктар па навуковай працы

__________ І.М. Прышчэпа

_декабря_ 2018 г.

СПРАВАЗДАЧА

па навукова-даследчай працы

**Дзейнасць дзяржаўных органаў і грамадскіх арганізацый савецкай Беларусі па аказанні дапамогі галадаючаму насельніцтву Паволжа**

**(1921-1923 гг.)**

(заключны)

Грант аспірантаў, дактарантаў і студэнтаў

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Навуковы кіраўнік НДП,

аспірант

__________ 28.12.2018 Г.Х. Базарэвіч

Нормакантралёр __________ 28.12.2018 Т.В. Харкевіч

Віцебск 2018

**РЭФЕРАТ**

Справаздача 83 с., 1 ч., 131 крыніца.

ГОЛАД У ПАВОЛЖЫ, БЕЖАНЦЫ, АГУЛЬНАГРАМАДЗЯНСКІ ПАДАТАК, АМЕРЫКАНСКАЯ АДМІНІСТРАЦЫЯ ДАПАМОГІ, ДАПАМОГА ГАЛАДАЮЧЫМ, АГІТАЦЫЯ.

Мэта даследавання: вызначэнне асноўных напрамкаў і вынікаў дзейнасці дзяржаўных органаў і грамадскіх арганізацый савецкай Беларусі па аказанні дапамогі пацярпелым ад голаду ў Паволжы (1921–1923 гг.).

Аб’ектам даследавання з’яўляецца барацьба з голадам і яго наступствамі ў Паволжы ў 1921–1923 гг. Прадмет даследавання – дзейнасць дзяржаўных органаў і грамадскіх арганізацый савецкай Беларусі па аказанні дапамогі галадаючым Паволжа ў 1921–1923 гг.

Матэрыялам даследавання паслужылі дакументы і матэрыялы нацыянальнага, абласных і занальных архіваў Рэспублікі Беларусь.

Метады даследавання: агульнанавуковыя: аналіз і сінтэз, індукцыя і дэдукцыя, параўнанне, мадэліраванне, абагульненне; спецыяльныя: гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнальны, гісторыка-сінтэзны, параўнальна-храналагічны, метад вымярэння якасных прыкмет.

Навуковыя вынікі працы, могуць быць выкарыстаны дзяржаўнымі органамі Беларусі, якія ў сваёй дзейнасці могуць выкарыстоўваць пазітыўны гістарычны вопыт свайго ведамства. Фактaлагічны матэрыял, які ўтрымліваецца ў працы, можа спатрэбіцца работнікам галіне культуры (экскурсаводам, музейным супрацоўнікам). Ён можа выкарыстоўвацца пры падрыхтоўцы турыстычных маршрутаў па тэрыторыі Беларусі і стварэнні музейных экспазіцый. Атрыманыя вынікі ўяўляюць цікавасць для супрацоўнікаў педагагічнай сферы. Даследаванне можа легчы ў аснову спецкурса, выкарыстоўвацца пры падрыхтоўцы лекцый, практычных заняткаў па шэрагу гуманітарных дысцыплін, дзе разглядаюцца пытанні ўзаемадзеяння дзяржавы і грамадства ў надзвычайных сітуацыях. Пры арганізацыі мерапрыемстваў, мэтай якіх з’яўляецца выхаванне спачування і міласэрнасці, культуры міжнародных адносін. Такія распрацоўкі будуць карыснымі для выкладчыкаў ВНУ, супрацоўнікаў ліцэяў, каледжаў, школ.